# Палеская рыбалка.

"Палескую рыбалку", як адну з форм гандлёва-гульнёвага дзеяння, у старадаўнія часы ладзілі на кірмашах Пінска, Століна, Турава, Жыткавіч і інш.

Змест: у драўляны чан з вадой запускалі жывую рыбу. Удзельнікі, заплаціўшы пэўную суму грошай (невялікую), рыхтаваліся да рыбалкі. Адначасова ў атракцыёне маглі ўдзельнічаць да двух дзесяткаў чалавек. У час гульні ім дазвалялася або стаяць з краю чана, або залазіць прама у чан, але лавіць рыбу яны павінны былі толькі голымі рукамі.

Па свістку арганізатара атракцыёна гульцы пачыналі лавіць рыбу. Тэрмін – толькі 5 секунд, якія ўсе гледачы лічылі хорам. Каб злавіць рыбіну ўа гэты кароткі час, трэба было праявіць нямала кемлівасці, рашучасці, сілы і хуткасці. Усё што зловіш – тваё! Некаторыя гульцы стваралі своеасаблівыя кааператыўныя саюзы: адзін з іх залазіў у чан і гнаў рыбу ў другі канец, а астатнія выцягвалі яе з вады і ўжо затым дзялілі паміж сабою.

Чан уяўляе сабой прамавугольную канструкцыю з дрэва даўжынёй 7-10 м, шырынёй 1,5 м і вышынёй 0,75-1 м.

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісалі Б. В. Каралёў і П. А. Гуд у 1983 г. у Пінску ад мясцовых жыхароў
К. Ф. Невядомскага (1911 г.н.) і У. У. Баравікова

# Палеская рыбная латарэя.

Латарэя-рыбалка была адным з папулярных кірмашовых дзеянняў Століншчыны, якую ладзілі яшчэ 20—30-ых гг. XX ст.

У вялізных бочках, ці драўляных чанах, або проста на рацэ Гарынь на ваду пускалі паплаўкі — кавалачкі дрэва, у якіх з двух бакоў замацоўвалі загнутыя ў пятлю цвікі. Да ніжняй пятлі паплаўка завязвалі вяроўку, або леску (з такім разлікам, каб яна дасягала дна ракі, або драўлянай канструкцыі), а да свабоднага канца вяроўкі замацоўвалі прыз. У латарэі-рыбалцы на 50—60 паплаўках



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаходзіліся, не бачныя ўдзельнікам, разнастайныя прызы. Разам з каштоўнымі знаходзіліся і жартоўныя: пляшка гарэлкі, рваны бот, нягодны хамут, кансервная банка, дзіравы тазік, маленькая плотачка, ці салёная цюлька і да т. п.

Гулец, заплаціўшы 20 грошаў, атрымліваў вуду і за адну хвіліну павінен быў выцягнуць выбраны паплавок. Ну, а які прыз — гэта каму як пашанцуе.

Як сведчыць інфарматар, гэтая латарэя мела вялікі поспех. За адну хвіліну надзвычай рэдка камусьці ўдавалася здабыць прыз, што прымушала ахвотнікаў па некалькі разоў удзельнічаць у латарэя, а гэта — прамая матэрыяльная мэтазгоднасць правядзення гэтага гандлёва-гульнёвага дзеяння.

Разам з тым, латарэя-рыбалка з'яўлялася сапраўдным відовішчам, на якое збіралася шмат людзей, якія рабілі разнастайныя парады гульцам, радаваліся іх поспехам, ці жартавалі з іх няўдалай рыбалкі.

П. А. Гуд, Н. І. Гуд, Беларускі кірмаш
Запісаў П. А. Гуд у 1979 г. у Століне Брэсцкай вобласці ад М. І. Мельніка (1929 г. н.).

## Сельскагаспадарчая латарэя.

На Століскіх кірмашах да Вялікай Айчыннай вайны вялізарную цікавасцьудзельнікаў штогодніх святочных таргоў выклікала бяспроігрышная сельскагаспадарчая латарэя. Тут разыгрываліся каштоўныя прызы (бычкі, парсючкі, бараны, пеўні, куры, гусі) і суцяшальныя (морква, бульба, яблыкі, слівы, грушы і да т.п.).

Латарэйную пляцоўку агароджвалі плотам, рабілі ўваходную браму, каля якой ставілі стол з латарэйным барабанам. Непасрэдна на пляцоўцы рабілі выставку тых тавараў, якія разыгрываліся ў латарэі. Асобна стаялі хатнія жывёлы, птушкі, ляжалі горкі гародніны, садавіны. А гледачы цісnуліся да плота, разглядаючы, што там яшчэ засталося, ці варта пайграць у латарэю, паспытаць сваё шчасце, удачу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ